Я спазнаю свет

ЖЫВЁЛЫ



УДК 373.2.016:811.161.1
ББК 74.102
Ж94

Пераклад з рускай мовы: Міраслаў Вячаслававіч Адамчык

Ж94 **Жывёлы.** — Мінск : Харвест, 2018. — 32 с. : іл. — (Я спазнаю свет).

ISBN 978-985-18-4185-7.

Вы хочаце, каб ваш падрастаючы малыш ведаў усё пра ўсё? Тады гэта кніга дакладна для вас, бо ў ёй:

— даступная падача матэрыялу;
— цікавыя заданні;
— маляўнічыя ілюстрацыі.

Займацца трэба не толькі карысна, але і весела!

УДК 373.2.016:811.161.1
ББК 74.102

ISBN 978-985-18-4185-7

© Падрыхтоўка і афармленне.
ТАА «Харвест», 2017

ЖЫВЁЛЫ

ХАТНІЯ ЖЫВЁЛЫ


Свойскімі называюцца жывёлы, якія жывуць з намі па суседстве. Шмат гадоў таму чалавек прыручыў іх. Цяпер яны даюць нам воўну і малако, нясуць яйкі, дапамагаюць выконваць складаную фізічную працу.

Хатнія коткі паходзяць ад сваіх дзікіх «суродзічаў». Лічыцца, што ўпершыню яны былі прыручаны чалавекам каля 5000 гадоў таму! Старажытныя людзі ўшаноўвалі гэтых грацыёзных жывёл і нават прыносілі ім ахвяры.



КОТКА

САБАКА



Сабакі ахоўваюць наша жытло, пасвяць статкі, абараняюць і берагуць сваіх гаспадароў. Яны выкарыстоўваюцца ў якасці павадыроў і памагатых чалавека на паляванні. Сабакі — адны з самых разумных хатніх жывёл.


КАЧКА



КОНЬ



ТРУСІК



Хатні конь — самы вядомы від сямейства конскіх. Ён хутка прывыкае да чалавека і робіцца яму адданым памочнікам. У дзікай жа прыродзе коні — статкавыя жывёлы, якія жывуць табунамі.

ЗНАЁМІМСЯ СА СВЕТАМ ЖЫВЁЛ

З найстаражытнейшых часоў людзі ўжываюць у ежу малако рознай жывёлы. Мы п’ем у асноўным каровіна або казінае малако. У ім утрымліваюцца тлушчы, вугляводы, пратэін і мінеральныя рэчывы.



КАРОВА

ГУСЬ



СВІННЯ



АСЁЛ



БАРАН



Асёл, хоць і вызначаецца моцным целаскладам, дакладнай хадой ды нястомнасцю, прыдатны толькі для не вельмі цяжкіх наўючванняў і не надта далёкіх пераходаў.



ЗНАЁМІМСЯ СА СВЕТАМ ЖЫВЁЛ



КУРЫЦА



ПЕВЕНЬ



ІНДЫК

Куры — самы шматлікі і распаўсюджаны від свойскай птушкі. Без курыных яек не абыходзіцца ніводная гаспадыня. Нягледзячы на сваю адносна невялікую вагу, яны ўтрымліваюць мноства неабходных нашаму арганізму рэчываў: бялкі, тлушчы, вітаміны, мінеральныя солі.



ЗНАЁМІМСЯ СА СВЕТАМ ЖЫВЁЛ

Хатнія гадаванцы — гэта жывёлы, якіх мы трымаем у кватэрах. І хоць яны не маюць асаблівай карысці, гэтыя мілыя істоты прыносяць нам вялікую радасць ад стасункаў з імі. Сёння сярод хатніх гадаванцаў нярэдка можна сустрэць пацука, шыншылу і нават бурундука.



БУРУНДУК



ШЫНШЫЛА

МАРСКАЯ СВІНКА





ПАЦУК

МЫШ





ХАМЯК

У прыродзе хамякі прабягаюць за ноч каля 12 кіламетраў у пошуках ежы. Але ў маленькай клетцы цяжка пераадолець і палову такой адлегласці. Таму гэтым гадаванцам патрэбна бегавое кола.